УДК 82-32

# ВЫКАРЫСТАННЕ АПАВЯДАННЯЎ СА ЗБОРНІКА МІХАСЯ ЛЫНЬКОВА “АСТАП” ДЛЯ ФАРМІРАВАННЯ ГРАМАДЗЯНСКАСЦІ І ПАТРЫЯТЫЗМУ ВУЧНЯЎ

**А. У. Лебедзеў**
*Сярэдняя школа № 26 г. Магілёва,*
*г. Магілёў, Рэспубліка Беларусь, olekleb@mail.ru*

У артыкуле разглядаецца выкарыстанне на ўроках беларускай літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі апавяданняў са зборніка “Астап” Міхася Лынькова для фарміравання грамадзянскасці і патрыятызму вучняў. Актуалізуецца праблема выяўлення ўчынка літаратурнага героя. Мэта аўтара даследавання – вызначыць учынкі дзяцей у апавяданнях пісьменніка, якія ілюструюць грамадзянска-патрыятычную пазіцыю, надзённую як для часу стварэння “малой прозы”, так і для XXI ст. Каштоўнасць атрыманых вынікаў заключаецца ў тым, што ў параўнанні з тэматычна блізкімі публікацыямі літаратуразнаўцаў дэталёва разглядаюцца ўказаныя ўчынкі, якія кваліфікуюцца і намінуюцца. Артыкул адрасуецца выкладчыкам філалагічнага профілю, настаўнікам беларускай мовы і літаратуры, студэнтам філалагічных і педагагічных спецыяльнасцей ВНУ і іншым зацікаўленым асобам.

***Ключавыя словы:*** апавяданні Міхася Лынькова; зборнік “Астап”; учынак літаратурнага героя; грамядзянскае выхаванне; патрыятычнае выхаванне; грамадзянскасць; патрыятызм.

# THE USE OF STORIES FROM THE COLLECTION ”OSTAP" BY MIKHAIL LYNKOV FOR THE FORMATION OF CITIZENSHIP AND PATRIOTISM OF STUDENTS

**A. V. Lebedzeu**
*Secondary school No.26 of Mogilev,*
*Mogilev, Republic of Belarus, olekleb@mail.ru*

The article discusses the use of stories from the collection in the lessons of Belarusian literature in institutions of general secondary education “Ostap” by Mikhail Lynkov for the formation of citizenship and patriotism of students. The problem of identifying the act of a literary hero is being actualized. The purpose of the author of the study is to determine the actions of children in the writer's stories illustrating the civil-patriotic position, which is essential both for the time of the creation of “small prose” and for the XXI century. The value of the results obtained lies in the fact that, compared with thematically similar publications of literary critics, these actions are considered in detail, which are qualified and nominated. The article is addressed to teachers of the philological profile, teachers of the Belarusian language and literature, students of philological and pedagogical specialties of universities and other interested persons.

***Keywords:*** Mikhail Lynkov's short stories; the collection “Ostap”; the act of a literary hero; gramyadyan education; patriotic education; citizenship; patriotism.

XXI ст. – час сістэматычных глабальных змен. Нестабільнае развіццё эканамічнай, палітычнай і сацыякультурнай сфер многіх дзяржаў абумоўлівае ў тым ліку зніжэнне маральнай устойлівасці чалавека, што ў сваю чаргу адмоўна

ўплывае на яго здольнасць зберагаць нацыянальныя каштоўнасці. У такіх умовах надзвычай надзённым з'яўляецца мэтанакіраванае фарміраванне новага тыпу грамадзян – "сапраўдных патрыётаў, самастойна мыслячых, актыўна дзеючых, якія валодаюць інтэлектуальным патэнцыялам і маральнымі прынцыпамі" [1; пераклад. – А. Л.] Выніковасць у гэтым працэсе дасягаецца праз рэалізацыю эфектыўных падыходаў і прынцыпаў, прымяненне дзейсных тэхналогій, метадаў і прыёмаў, ужыванне слушных форм. Адзін з практычна карысных "інструментаў" – творы прыгожага пісьменства.

Выкарыстанне апавяданняў са зборніка "Астап" Міхася Лынькова для фарміравання грамадзянскасці і патрыятызму вучняў абгрунтаванае тым, што "малой прозе" пісьменніка, на думку В. Каваленкі, Ф. Куляшова, А. Шарапавай і іншых літаратуразнаўцаў, уласцівы бясспрэчны выхаваўчы патэнцыял. Творы класіка вывучаюцца ў V класе і рэкамендуюцца для дадатковага чытання ў X класе.

Паколькі "Прыярытэтнай задачай урокаў беларускай літаратуры з'яўляецца фарміраванне ў вучняў патрыятычных каштоўнасных арыентацый…", то "Асаблівую ўвагу неабходна надаваць творам патрыятычнага і грамадзянскага зместу. Перш за ўсё гэта творы, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне" [2]. Яе падзеям і прысвечаны зборнік "Астап". З адзінаццаці апавяданняў, што ўваходзяць у кнігу, сем М. Лынькоў стварыў у 1942-м годзе і чатыры ў 1943-м. Нягледзячы на тое, што ў творах адлюстраваны рэаліі пераважна пачатку вайны, апавяданні зборніка змяшчаюць яскравыя элементы для фарміравання грамадзянскасці і патрыятызму вучняў – учынкі персанажаў. Пры аналізе літаратурных твораў на ўроках беларускай літаратуры якраз рэкамендуецца звяртаць увагу вучняў на ўчынкі персанажаў, што ілюструюць, у прыватнасці, грамадзянска-патрыятычную пазіцыю [2].

Учынкі літаратурных герояў М. Лынькова – сведчанне любові да Радзімы, гатоўнасці яе абараняць і стваральна дзейнічаць дзеля росквіту.

Хоць вобразы дзяцей адлюстраваны ў дзесяці з адзінаццаці апавяданнях са зборніка "Астап", але ўчынкі дзяцей прадстаўлены ў двух апавяданнях: "Васількі", "Пацалунак". Гэтыя і іншыя ўзоры "малой прозы" М. Лынькова сістэматычна даследаваны літаратуразнаўцамі. Аднак публікацыі, прысвечаныя непасрэдна выяўленню ўчынкаў дзяцей, іх кваліфікаванню і намінаванню, нешматлікія. Дадзеную праблему кантэкстуальна закранаюць В. Каваленка [3], Ф. Куляшоў [4], А. Шарапава [5], якія разглядаюць учынак Міколкі ("Васількі") і намінуюць яго <u>помстай</u>. Яе прычыну выяўляе Ф. Куляшоў: "Боль і нянавісць нараджалі прагу помсты ворагу, выклікалі жаданне ўсімі сіламі і сродкамі знішчаць яго" [4, с. 117].

*Міколку* наўрад ці трэба абвінавачваць у прынятым рашэнні (знішчыць людзей, хай і фашыстаў) праз *матыў*: немцы забілі яго сястрычку і маці. Пазбавілі не толькі родных, але і шчаслівага дзяцінства. *Мэта* – расправіцца з карнікамі – з'яўляецца ў Міколкі, напэўна, яшчэ ў садзе, калі ён знаходзіць целы родных: "…каменем навісла над ім неадчэпная думка: нешта ж трэба зрабіць" [6, с. 10]. Але, хутчэй за ўсё, задума ўзнікла, калі хлопчык застаўся сам-насам з

сабой: “Зашыўшыся ў каноплі, ён праляжаў усю ноч, пакуль не выплакаў усіх слёз” [6, с. 11]. На карысць гэтай здагадкі сведчыць наступны факт: “А раніцой бачылі людзі, што ён хадзіў чагосьці ў лес” [6, с. 11]. Наведванне лесу, як высвятляецца, не было спосабам развеяцца. Туды хлопчык хадзіў за *сродкам* дасягнення мэты – гранатай. Магчыма, у тую самую ноч ён успомніў, як “…прасачыў раз, …як бацька яго разам з другімі дзядзькамі нешта ездзілі ў лес паначы і адтуль прыехалі з пустымі драбінамі. Вазьмі і запытайся тады Міколка: «То вы гранаты і куляметы вазілі ў лес хаваць…»” [6, с. 8–9]. Сапраўды: *дзеянне* – кіданне зброі ў машыну з немцамі – хлопчык выконвае пры дапамозе ўдала замаскіраванай гранаты: “Міколка… ў імгненне вока апынуўся ля самых акон машыны. «Наце ж вам за маці, за сястрычку маю!» Ён проста перакінуў у акно нейкі скрутак, загорнуты ў газету” [6, с. 12]. Калі б Міколка выжыў, то *вынік*, напэўна, прытупіў бы яго боль расстання з роднымі: “Асляпляючы слуп агню і жалеза… Пазляталі шапкі з коннікаў, сёй-той бразнуўся вобзем… З перакошанымі ад страху тварамі беглі салдаты з насілкамі, з лапатамі. Рэшткі машыны дагаралі на дарозе, дыміліся, тлелі на каменнях чорныя мундзіры” [6, с. 12].

Як і Міколка, *Вулька* (“Пацалунак”) таксама змагаецца разам з усімі за адну агульную народную справу. Ф. Куляшоў уражаны: “Нават маленькая Вулька дапамагае дарослым у іх барацьбе” [4, с. 121]. Учынак – аказанне дапамогі бабулі – Вулька выконвае добрасумленна, нягледзячы на гурбы снегу, па якіх дзяўчынка ледзь прабіраецца з цяжкім чыгунком вугалю і попелу. У сваім учынку Вулькай рухае *матыў* выканання просьбы бабулі Аксінні: “А сёння бабку пагналі немцы ў абоз – вазіць салому. Толькі і паспела яна насыпаць у чыгунок вугалля і неўзаметку шапнуць Вульцы: «Ты будзь разумніцай і, калі я паеду, занясі чыгунок… у гумно… На ток пастаў, ды падалей ад сцен, каб не здарылася пажару, не да-а-ай то божа! А сама хуценька бяжы назад, пільнуй хату…»” [6, с. 42]. Варта заўважыць, што Вулька не разумее, навошта штодзень выносіць вугаль і попел, і нават лічыць бабулю дзіўнай: “Тры дні ўзапар выносіць попел з хаты. Дзе гэта відана, каб так часта попел выносіць, толькі хату студзіць” [6, с. 42]. Яшчэ не цяміць дзяўчынка, навошта заносіць вугаль і попел няблізка ад дома. Падтрымлівае яе ў гэтым пытанні хітры калабарацыяніст сусед Касмыль: “Дык чаго ж ты далёка так нясеш яго?” [6, с. 41]. Аксіння абяцала растлумачыць унучцы, але не паспела. Таму ў дасягненні *мэты* – дагадзіць бабулі – дзяўчынка была гнуткай: “Вось яна і зрабіла ўсё, як загадала бабка…” [6, с. 42]. Каб парадаваць бабулю, Вулька насуперак нязручнасцям выкарыстоўвае дадзены Аксінняй *сродак* – чыгунок: “Вулька… хутка ўзялася за чыгунок. Цяжка яго несці ў адной руцэ. Балюча ўразаецца ў пальцы анучка, у якую завязаны чыгунок. Трэба ўвесь час пераменьваць руку” [6, с. 40]. Старанна выконваемае *дзеянне* – штодзённы вынас з дому вугалю і попелу – усё ж не завяршаецца намечаным *вынікам*: замест гумна дзяўчынка апаражняе чыгунок у снег: “Вулька… абярнула чыгунок і, абпальваючы далонькі, дзьмухаючы на іх, высыпала з яго вугаль і попел… Вулька пастаяла з хвіліну… і, спяшаючыся, пабегла дахаты, усё думаючы аб тым, што ж скажа яна цяпер бабулі” [6, с. 41–

42]. Дзяўчынка зрабіла б па плане, калі б яе не заўважыў здраднік Касмыль, які ўсё ж не прычыніў зла дзіцяці.

Вобразы Вулькі і Міколкі аб’ядноўвае адна рыса: “Іх учынкі філасофска асэнсаваны” [4, с. 117]. Ф. Куляшоў тлумачыць: “Тое, што яны робяць, асветлена… думкай аб праве свабоднага чалавека змагацца да апошняга дыхання… І таму яны… ідуць насустрач пакутам і смяртэльнай небяспецы” [4, с. 117].

Адзін з напрамкаў зместу дзейнасці па грамадзянскім і патрыятычным выхаванні вучняў – выхаванне каштоўнасных адносін да гістарычнай спадчыны і дасягненняў беларускага народа, фарміравання пачуцця нацыянальнага гонару [1]. У гэтым сэнсе зварот да творчай спадчыны М. Лынькова ва ўмовах глабалізуючага свету заканамерны. Учынкі літаратурных герояў апавяданняў са зборніка “Астап” – “маральны капітал, з якога новыя пакаленні чэрпаюць духоўную сілу, асэнсоўваюць бясспрэчную каштоўнасць мірнага неба над галавой” [2].

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Методические рекомендации по реализации программы непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи на 2021–2025 годы [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://vospitanie.adu.by/organizatsiya-vospitaniya/metodicheskie-rekomendatsii.html. – Дата доступу : 23.10.2024.
2. Дадатак 2 «Асаблівасці арганізацыі адукацыйнага працэсу пры вывучэнні вучэбных прадметаў “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура”» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://adu.by/ru/homeru/obrazovatelnyj-protsess-2023-2024-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie/uchebnye-predmety-v-xi-klassy/belaruskaya-litaratura.html. – Дата доступу : 09.09.2024.
3. Каваленка, В. А. Міхась Лынькоў / В. А. Каваленка // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. – Мінск : Беларуская навука, 2002. – Т. 2. – С. 370–412.
4. Куляшоў, Ф. Час выпрабаванняў / Ф. Куляшоў // Міхась Лынькоў : Нарыс жыцця і творчасці. – Мінск : Народная асвета, 1979. – С. 111–168.
5. Шарапава, А. В. Міхась Лынькоў (Міхіл Ціханавіч Лынькоў) / А. В. Шарапава // Беларуская дзіцячая літаратура : вучэбны дапаможнік / А. М. Макарэвіч [і інш.]; пад агульн. рэд. А. М. Макарэвіча, М. Б. Яфімавай. – Мінск : Вышэйшая школа, 2008. – С. 242–267.
6. Лынькоў, М. Збор твораў / М. Лынькоу : у 8 т. – Мінск : Навука і тэхніка, 1982. – Т.2 : Апавяданні і нарысы. 1942–1975. – 542 с.